Янка Юхнавец

ЗНАЁМСТВА ІДУЧЫ ДА РАКІ СПАТКАНЬНЯ

ЗНАЁМСТВА

Учора я спаткаў, убачыў чалавека, пра якога шмат піша газэта й часапіс, дзе я працую сакратаром блізу тры гады. Ня ведаю, ці буду калі-небудзь паважаць ягоныя пісаньні-творы (мне радзьва прыходзіцца зацемліваць іх у канцылярскіх рэестрах), аджа, што ўбачыў учора, спадабалася да апошняе часіны майго жыцьцёвага ўражаньня.

Як не паверыць па усёй краіне вядомай газэце і часапісу! Нават благая мэлёдыя пасьля доўгага тораньня запамінаецца ды адчуваецца лепшай, чымсьці былі, або будуць. Ды ці яго ж віна, што пра ягоныя творы гэтак шмат гаворыцца? У звычайных людзей могуць зьявіцца прызвычаі паверыць таму, чаго ніколі не было ў іхных думках ці развагах. Даверлівасьць, з чужой волі, шмат зырчэйшая, чымсьці свае назіраньні за жыцьцёвымі адчуваньнямі.

Аджа, пісьменьнік — пахвала ды посьпех творчы цэлае нацыі; ён мог хлусіць пра жыцьцё.

Я гвалтаваў час, свой час, цярплівасьцяй прачытаць ягоныя кароткія апавяданьні, а потым раман у двух частках. Ён не выбіраў мяне быць крытыкам, а я ніколі не зьбіраўся пісаць творы, ды вось сяньня пасьля «агледзінаў» вялікага, няўторнага пісьменьніка, адважыўся сабраць маю сьціплую мудрасьць моўную і напісаць, калі не кароткае апавяданьне, дык хоць начырк, самы сьціплы начырк-зацемку. Я ня вельмі раздумоўваюся над сюжэтам, ці то кампазыцыйнай формай, я адчуваю сваю тэму ўсім сваім целам і душой. Мне прыкра казаць «душой», бо яе можна апляваць, зганьбіць, і яна будзе ўсё тэй «душой», прыдушанай, моўкнай.

Я люблю здаровае цела. Яно створыць і зробіць усё, што можа хто пакінуў недакончаным, нястворaным у ягоным жыцьці. Калі б мне маё пісаньне адчуецца як «адведкі», я пакіну яго як нядобра напісаны канцылярскі рэестар. Я не прынукваюся напісаць гэтыя кароткія зацемкі. Калі толькі

што-небудзь прапусьціў у іх, дык не таму, што я атупанеў ад варсьцівасьці ўспомніць іх па парадку на паперы, а таму, што жыцьцё маё — сакратара — няхітрае, не стамлёнае камфортам, ад якога толькі цяжарэеш няздатнай сьвядомасьцяй: кажны наступны дзень мусіш быць хоць крыху прырыхтаваны да працы. Я заўсёды напагатове ці са смакам зьесьці лусту хлеба, ці кахаць сваю суседку. Мне не патрэбна прыдумваць жыцьцё на заўтрашні дзень. Шэсьць або пяць раніцаў я барджу на працу ў канцылярыі, а па працы купляю сёе-тое зьесьці, сігаю да кватэры пяшком, бо часта не стае грошы на аўтабус або трамвай. Я люблю гэтае жыцьцё, як той вялікі пісьменьнік. Для мяне ўсе людзі — пісьменьнікі свайго бытаваньня. Аднак навошта быць кажнаму пісьменьнікам? Нас шмат каго хвалюе жаданьне павесяліцца, паспрачацца пра апошнія спартыўныя змаганьні, мы любім спадзевы, напісаныя не ў Эвангеліі, не ў раманах вялікіх пісьменьнікаў, мы гэтак-гэтак мацуемся ў жыцьці жаданьнямі сьціплымі: каб неяк адзін другому не перабіць сярэдзіны.

Мае шчырасьці таксама ня вельмі патрэбныя людзям, нават маім найлепшым сябром. Бо ці варта рабіцца агрызьнём дзеля таго, што не спадабаўся нацыянальны пісьменьнік? Я шмат думаў пра гэта. Больш чымсьці пра аплату за кватэру. Я ня ведаю біяграфію гэтага пісьменьніка, можа, ён таксама быў сакратаром. Божа мой, яшчэ як! Ня можа ж ён хлусіць пра сваё жыцьцё, як у ягоных творах. Але калі падумаць, па-свойму асудзіць творчую хлусьню: я таксама эгаіст. Пачынаю любіць свае зацемкі, хоць яны далёка, далёка ад сапраўднага мастацкага твору, яны звычайны памфлет, у якім зьмешана філязофія з псыхалёгіяй, а палітыка з рэлігіяй... Аднак даруйце мне, наступны раз я клясычна падзялю мае зацемкі гэтак, як трэба, гэтак, як у навуковых кнігах, ці энцыкляпэдыях.

Яшчэ ў пачатку я сказаў, што свае адчуваньні ды назіраньні за сабой і нашым жыцьцём не выкасоўваю з душы. Яны адчуліся целам і розумам. Мажліва, ад сакратарскага адчуваньня зацемліваць усё, што здарылася за дзень у рэдакцыі, я нахільны запісваць меркаваньні й назіраньні ў сваім дзёньніку.

— Гэта быў дзень! — клічна, ня ў меру ўражаньняў маёй мовы, я тору гэты ўсклік у той час, калі думкі снуюцца навакол пісьменьніка, як вада каля ўрослага дрэва сярод ракі. Я ня ведаю, падумаю некалісьці, пастарэўшы, чаму ўразіў мяне пісьменьнік. Што ён наведаў рэдакцыю, якая плоціць яму ганарары, зарабляе на ягоных творах? Адно скажу: у мяне няма

зайздрасьці да яго, бо я не люблю ўсё, што ён напісаў, хоць ці за дзесяць, ці за трыццаць год.

Ці падстрыжаны, не спакмеціш, у прыгладжаным гарнітуры, з лёгкім партфэлем пад руку, ён найперша ўвайшоў да майго пакою. Я толькі што запісаў апошнюю рыэстру пра друкарскія памылкі ў прамове міністра гандлю.

— Я хачу бачыць рэдактара, — адразу зьвярнуўся ён да мяне.

— Рэдактар на курортах, — адказаў я, гэтакім самым ягоным манэрам і тонам звароту.

— Пісьменьнік ЭН.

— Дзякую!

І ўсё пайшло наўпроста. Незамужняя бугалтарка, пахвальніца ўсяго, што толькі ня губіцца ў навінах каханьня, прывітала яго.

— Прыемна бачыць вас!.. Усе словы вашыя ў апавяданьні «Не надзвычайнае сэрца» памятаю... Не забудуся!..

— ...вось дык смоўж, — падумаў я. — А зьлічыць два на тры ледзь зможа.... Ну што ж, валі, дзяўчына! Пра чорта загаворыш, і ён заўсёды зьявіцца!

Пісьменьнік падзякаваў бугалтарцы і сеў на ўсплечак майго крэсла.

Перад гэтым днём мне сьніўся сон. Дома я чытаў газэту, ці то айчынную, ці то замежную, і раптам да мяне, хто яго ведае як, уваходзіць чалавек мужайны станам, але стары, старэйшы за восеньскі грыб, і хоча прагнаць мяне з кватэры, за якую апошні месяц я заплаціў сваячасна. Найбольшы мой вораг — гэта плата за кватэру. Чорт яе меў у пекле — плачу ня дробныя грошы!.. Але я пра сон дакончу. Як сон у руку! Той дзядок у сьне таксама сеў адразу на ўсплечак майго крэсла, якое прынёс я па радзе гаспадыні з суседскай вуліцы — камусьці не патрэбнае. Гэтае крэсла, адрамантаваўшы, я любіў і вартасьціў каштоўнасьцяй. Думаў яго нават упісаць у мой пасьмяротны тастамэнт. На ім была выпалена пячатка: Мэяр, 1800. Можа, гэта быў нумар або нумар мадэлі, але ўверыўся, што крэсла зроблена ў васямнадцатым стагодзьдзі. У крэсьле бывала сядзела гаспадыня-удава, маладая, прыгожая жанчына. Калі б крыху даўжэй зацягнулася ейнае наведваньне маёй кватэры, я, пэўна, канчальна закахаўся ёй і мог не шукаць іншага каханьня на зьмену. Пра гаспадыню, калі б уздумалася раней пісьменская натхнёнасьць, я веру, мог напісаць таленавіта. За ейную шчырасьць ёсьць што адказаць шчырасьцяй. Яна не дазваляла мне шмат сапраўднасьцяў ейнай душы, бо была

ўласьніцай, а я верабей, сапраўдны верабей, хоць і нарадзіўся мужчынам. Яна ведала свае справы, а я свае моцы перавараччаў у нейкія небывалыя мроі, ад якіх пераканаесься толькі тады, калі сьвітанкам ня трэба бегчы купіць хлеба, бо няма гроша лішняга ў кішэні.

Гаспадыня неачмурэлая жанчына. Мела свой двухпавярховы дом. Чаму мела яго, ня ведаю. Собскасьць нікому ня шкодзіць. Нават невялікая ўласнасьць ёсьць духоўнае багацьце асабістасьці. Няхай сьмяюцца, што я параўноўваю гэта да духоўнага багацьця чалавека. Можа здарыцца, я стануся філёзафам грамадзкіх навукаў і тады павучу людзей: мей сваё, калі ўмееш мець, а пра дзяржаўную нераўнавагу сацыяльнага парадку ня буду гаварыць, бо, можа, я гультай... Ах, валей зраблю адступ! Скончу пра гаспадыню. Хаця не. Яна таксама вінна паказаць мой пісьменскі талент. Гаспадыняй маёй (іх шмат, у малых і ў вялікіх гарадох) можа захапляцца. Ёй падабалася жыцьцё гэтак, як яно здарылася.

Аднойчы, калі перастала заходзіць да мяне, яна пазнаёміла мяне з кутніцай, што заарандавала цесны-цесьненькі куток ажно пад самай страхой. Зімой (Адам із Эвай гэткай цярплівасьці ня меў) там было сьцюдзёна, вельмі сьцюдзёна, а ўлетку душна... Сумніву не было: дзяўчына была маіх гадоў, яна магла быць добрай мацерай і сужэнкай. Яна пачала кахаць мяне. Часталa мяне насмажанай у тлушчы бульбай, і ейныя вусны, і ўсе рухі, калі я быў побач, краталіся шчырай ды захопнай кволай. Я ніколі не спытаў як імё яе і адкуль прыехала жыць сюды, не пыталася і яна пра маё, пра мяне. У яе не было астанкаў маладзенскага жыцьця, яна мо' толькі несправядліва пазнала яго. Але па-мойму выходзіла, што ўсе мусяць жыць гэтак, як натрапіцца. Уначы рыплівыя ўсходкі да ейнага пакою перасталі скрыпець. Я не жадаю зьдзіўляцца мінуламу, спаткаў яе на вуліцы каля багатага магазыну модных вопраткаў.

— Дабрыдзень, Мікола!

Пазнаў адразу. Яна была з аднагодкам-хлапчуком, зь ейным сынам. Яна даўгавата трымала маю руку і, калі гаварыла, патрэсвала яе, быццам даўні спартыўны трэнер.

— Я не дурная... Мне быў патрэбны ты. Я магла паважаць і кахаць цябе, — на разьвітаньне сказала былая кутніца па доме.

І вось тады я ўспомніў, што, калі перасталі ўначы скрыпець усходкі да ейнага пакою, ёй гаспадыня найшла законы: яна ня мае права жыць у ейным доме.

— Па-ранейшаму адрасу жыву — заходзь, — адказаў я. Ахапіўся. Як па-сакратарску сказаў. Яна ўсьміхнулася, памахала рукой, пайшла да магазыну. Аднагодак-сынок насурмлена аглянуўся на мяне. Ён не спадабаўся мне. Шкляныя начышчаныя дзьверы зачыніліся за ім.

Я малады мужчына. Я багацейшы «душэўна» за маіх знаёмых. Але я пэўны, што напішу тут, ня будзе шчырасьцяй укорніка. Я толькі ашчапэніўся супроць гэтага пісьменьніка, ён завельмі прыкараскаўся да маёй «душы». Ах, як нялюба: «да маёй душы»! І нічога не зраблю. У адмен я нічога не атрымаю. Ды адмаўляць сутнасьць маіх думак, што для мяне не надзвычайныя, не зьбіраюся.

Гэты пісьменьнік, хочацца торыць, жыве таксама ў доме маёй гаспадыні, на першым паверху дакладна асяліўся ў блізасьці яе. Цяпер я ведаю: ён жыве там больш году, якраз час, калі да мяне перастала заходзіць гаспадыня і я перастаў хадзіць да ейнай, маіх гадоў, кутніцы. Ідучы да свайго пакою, асабліва зімой, усходкі скрыпелі моцна, вось тады гаспадыня бывала часта адчыняла дзьверы свайго пакою, або радзьвей (заўсёды ў шаўковай накідцы) — зь ягонага, пісьменьнікавага, пакою і заўважала мяне:

— Не стадола — крыху цішэй ступайце.

Я ж наадварот, пытаўся зь невясёлым усьмехам:

— Як ваша здароўе? Добры вечар!

— Дзякую! Не турбуйцеся!.. Яшчэ тыдзень даю — больш чакаць не магу — трэба налогі за дом аплачаваць... Абяцаеш?

— Абяцаю — а як жа?

— Пакінь абяцаць, а плаці як гэты чалавек плоціць, — паважліва паказвала двума пальцамі на кватэру пісьменьніка.

Я ніколі ня думаў, што вялікі пісьменьнік жыве ў доме, дзе жыву я і пішу гэтыя зацемкі. Пасьля гаспадыніных напамінаў аплаціць сваячасна кватэрную плату я шкадаваў дні, калі можна было ацішаць маё і ейнае адзіноцтва. Тады яна б ніколі не страціла сваё пачуцьцё да мяне мужчыны, маладога мужчыны, а я, як школьнік, не сароміўся яе за неаплачаны кватэры доўг.

Я хвалю цела, адмаўляю душу, а вось не парупіўся прывучыць гаспадыню сумаваць па майму целу... Ды не! Буду цялесна цьвярозым чалавекам! Навошта падчэпліваць паражнечу да маіх суровых раздумваньняў? Я мушу ці сяньня, ці заўтра паслаць мае зацемкі гэтаму пісьменьніку. Я дам яму пісьменьніцкія тэмы...

Я не шукаю часіны, каб з кімсьці спрачацца. Я ня ўсё люблю ў Шэксьпіра, бо я завельмі сучасны чалавек дваццатага веку, але часта паважаю помніць некаторыя ягоныя мудрасьці. Адну зь іх люблю ў «Дванаццатай начы» — «Усе сябры мае, а сябры ворагі мае».

...дарагі пісьменьнік, чытай зацемкі так, як яны запісаныя мной ад мяне самога, або выбірай у адпаведнасьці твайму настрою. Не падумай пра літаратурныя залёты якога-небудзь няўдачніка, я толькі не жадаю называць сябе прафанам, бо тады хутчэй падумаецца гэтак, самы непатрабавальны чалавек, але з напагатовай адпіхнуць ад сябе ўсё неспадобанае ў жыцьці, усё, што празьмерна падчэпліваецца на мой горб духовы й цялесны. Уцеміце: я вярблюд, якому не стае вады!

* * *

...пісьменьнік памацаў валасы. Зачостка была пушністая, ажно да самых вушэй валасы, яны быццам грэлі ягоны розум, у якім магло выседзецца штосьці мілае-даражонае ў літаратуры. Ён ведаў: яму ёсьць пра што пісаць. І ён пра ўсё піша шмат — не шкадуе слоў, няхай абвяшчаюцца! Яшчэ шмат не напісана пра дастатак шчасьлівых дзён у джунглях, пра нож, які апынуўся пасьля забойства ў таверне, як празорцы-ліхтарні на абтоку перашкодзілі начному лёту птушак у вырай.

— Ідыёт — сапраўдны й непапраўны! — прагаманіў чутна пісьменьнік.

...усю пісьменьніцкую трацьву ён гэтак здабываў, як дзесьці ў рудніках здабываюць вугаль. Яму было нялёгка. І вось кадзе, неспадзеўна, нейкі памаўзень, пачынае адмаўляць тое, што ўкарэнілася ў сэрцы пісьменьніка добрасьцяй жыцьця... Ён разбагацеў. Не патрэбна бегаць з наступным апавяданьнем да рэдакцыяў і чакаць ад іх лістоў з павядамленьнямі: будзе надрукавана, або наадварот: рэдакцыя ня вырашыла пра вартасьць твору... Але нарэшце перамянілася іншым. Яму замаўляюць напісаць апавяданьні, радзьва пасылаюць рэпарторам у судовыя залі або да афрыканцаў у нетры джунгляў. Яму падабаліся даручэньні, а тое, што любіш, ніколі не адмовіш. Ён вельмі добра разьбіраўся ў жаданьнях рэдактараў. І яны таксама былі турботныя пра яго... Ды вось цяпер — ах, як неспадзеўна! — пачынае пагарджаць нейкі невядомы чалавек-сакратар, дасылае яму вар'яцкія зацемкі. Хто ён гэткі? Сакратароў шмат. Сакратар працуе толькі ў аднэй выдавецкай арганізацыі, а ён, пісьменьнік, удзельнічае ажно ў трох часапісах і выданьнях. Навошта гэтаму сакратару задумалася патрабаваць ад яго тое, чым ён ніколі не

цікавіўся ні ў маладзенстве, ні ў гадох выраслага чалавека? Навошта было чытаць гэты ліст? Але вельмі добра, што тое-сёе прачытаў у ім.

Сёньня ён атрымаў прэмію ад «Саюзу апекі над хатнімі жывёламі». Яму ўрачыста аддала суму грошай ягоная гаспадыня. Яна сябра гэтага згуртаваньня. Было люба, што сукня на ёй абцягвалася туга, бадай скура на добра ўгадаваным бульдогу. Яна пры ўсіх пацалавала пісьменьніка ў вусны і нават правяла па плячы далоняй. Яму, адзінокаму мужчыну, яна адчулася тады блізкай і роднай, і пасьля ўрачыстасьці, увечары, абавязкова не праміне пераканацца зноў у гэтай чутнай блізкасьці, але ён нізавошта не спытае ў яе, якіх хатніх жывёлаў трымае. Як ведаю, у ейным доме ёсьць прусакі і летам блохі, іх цьма — ні пераб'еш!

...апрануў спартыўную жакетку. Пайшоў да парку. Шмат хто ведаў яго з суседзяў і наведальнікаў парку. Але сяньня ён прайшоўся ўздоўж паркавых алеяў і паўз кустоў бэзу ўцьвелены. Ні аднаго пялёстку з шыпшынаў не паклаў у грудочак каля лаўкі. Усё думаў пра сакратара з рэдакцыі і ўспомніў. Гэта зусім проста. Сакратар піша, што жыве зь ім у адным доме. Пабарзьдзіў да кватэры.

...даражоны пісьменьнік, па праўдзе, для мяне вы адно й тое: ці былі вы, ці не былі на зямлі нашай! Але даруйце за маё ашчапэнства на вас! Людзі чагосьці, заўсёды чагосьці хочуць ад людзей. Яны крыўдзяць адзін другога і тым часам астаюцца з тым самым адным: зь сьмерцяй.

Я не пахапнік ці можа прыроджаны, ці можа ўзгадаваны — ня ведаю. Але я хмурлівы не ад таго, што ня ведаю, што рабіць у жыцьці маім, а таму што вельмі адчуваю абавязкі рабіць: вяшчуніць дабро на зямлі. Мне жадаецца ўсё пераражыць у жыцьці. А часу, Божа мой, тры кроплі на смаглыя вусны!.. Лепш напішэце пра вёску — я нарадзіўся ў вёсцы. Люблю завірухі на нівах, каля вясковых сялібаў; лета й зіму ў пушчах ды барох. Узімку ў лесе — не ў джунглях. Мароз трашчыць, як кажуць сяляне, але пад шатамі елак затульна, толькі зрэдку зь неба пырскае ў твар сьняжынкамі; сонечныя праменьні, сапраўдныя косьмы залатыя, сьцелюцца каля гонаў дрэў пад тваімі ступнямі; клёст сьпявае, серанок трашчыць пад ступкамі лася або казулі, нат' у сьцюжу там поўна жыцьця, і яно, здаецца, адтуль пачынаецца; рэха ад сякеры лесасека ядзерыстае, трубнае, бы калі ўяўляць гэтак. Вясьняная армія памалу, дзесьці з воддалю, акружана наступае на Зіму. Або напішэце пра мяне. У нашай

вясковай царкве прывучалі мяне зь іншымі хлапчукамі прыслужваць сьвятару. І навучыўся, калі сьвятар казаў «Амін», я натрапляў часіну паласавацца пражаным ці вымачаным бобам, што заўсёды ў маім кішэні. Аднойчы, пакуль памагаў сьвятару перамяніць царкоўнае апраньне, адважыўся пачаставаць яго. Ён усыпаў жменьку пражанага гароху ў свой вялікі рот і зьеў за сьвятымі варотамі. Падзякаваў, а тады ў сьвятым казаньні зганьбіў маіх бацькоў за благое выхаваньне дзяцей. Я меў ажно дзьве болесьці: крыўда на сьвятара і неабыякае пакараньне ад бацькоў. Яны былі набожныя, і з іхных божапакаральных рук мяне выратавала бабуля. Загрэла, «загрэла» добра, знячэўку, кійком па галаве — не па маёй, а па бацькавай. Бацька, дакараючы мяне, стаяў па-афіцэрску, не спадзяваўся, бабулінага «зьнячэўку» дастанецца яму. А праз два дні мая бабулька памерла. Я шкадую яе больш, чымсьці мая мама... Даруйце, што заклікаю вас пісаць тое, што падабаецца мне! Пішэце што падабаецца, але ня хлусіце, а калі думаеце хлусіць, дык не рабеце з нас паганскую доўбню на ўзгорку.

...калі падумаць кмена: навошта было мне сьцягваць вас? Што прынясе або задаволіць час маё дацінаньне вам? Мы абое па-свойму будуем сваё жыцьцё. Вы ня маеце зайздрасьці да майго, а я да вашага. Аднак няхай маё праклінаньне вас апынецца ў вас... Але хай чорт разьбярэцца з усім, на заўтрае я адумаўся: сакратарскія праклёны нікому ніколі ня шкодзілі! Прыкладам, хоць бы гэткі праклён:

Прыціхні,
сам сабе законны вораг,
ён цягар у тых мясьцінах,
куды мяне із песьняй прынясуць,
і будзе нам тады усё
усё адным, усё нічым.

А ўсёткі блага, што я ўшчыраўся разважаньнямі пра вас, бо нічога свайго патаёмнага не пакінуў сабе. Маё кананьне супраць вас ніякіх зьменаў на зямлі ці ў Айчыне ня зьдзейсьніць. Бывала, калі меў дзесяць-пятнадцаць год, пасьля заняткаў у школе або ў часе летніх канікулаў я любіў пабарукацца з калодай-стаўбуном, ад гэтага ходаньня чуўся здаровым і шчасьлівым. Але аднойчы калода ледзь не задушыла мяне, ад таго часу зразумеў: тое, што наўмерыў асіліць у жыцьці, ці нават у кажнадзённым захаваньні, — асільвай да перамогі. Не разумець сваю сучаснасьць можа толькі пашчонак, або больш зразумела: дурань.

Але назначаць, урочыць будучыню ня лёгка! Будучыню азначаюць неспадзеўныя змаганьні людзей.

* * *

Пісьменьнік убачыў гаспадыню на калідоры, якраз стукала ў дзьверы да ягонага пакою. Яна апранутая як заўсёды ў шаўковую накідку.

— Я думаю, напэўна, сьпіць. Дзе ж ты быў?

— Нідзе. Бачыш вярнуўся.

Яна пяшчотна даткнулася далоняй да падбародача пісьменьніка. Ён адамкнуў дзьверы. У пакоі гаспадыня абняла й пацалавала яго больш сваячна, чымсьці ў зале, калі ўручала яму прэмію за пісаньні шанаваць зьвяроў-жывёлаў.

Пісьменьнік у сваіх думках таксама меў сваё. Пацалаваў шчыра гаспадыню, а тады, як сяляне кладуць або складаюць гарбузы на воз, беручы іх па два ў ахапак, міла падхапіў адзадзя і падняў яе перад сабой. Гаспадыня, узьнятая, пачала цалаваць ягоны лоб і скроні. Яна не кранулася апусьціцца на падлогу — люба быць у ягоных руках. Ён занёс яе на ложак. Яна квола распласталася. Нахрасна палажыла нагу на нагу.

— Чаму не ажаніцца нам?.. Цяпер у доме маім толькі ты й я. Пазаўчора і гэтага сакратара выгнала. Шкадую, што раней не зрабіла. Вучыцца надумаўся. Ва ўнівэрсытэцкай бурсе будзе жыць.

— Гэтых сакратароў трэба варам выганяць.

Гаспадыня не распытвалася: чаму? Трэці, нават успамінаючы, — лішні. Пісьменьнік радаваўся. Сакратара няма. Вясёла ўсьміхнуўся. Сунежна правёў пясьцёй па гаспадыніных мякацях. — Жаніцца хочаш? — ліпнучы да гаспадыніных вуснаў прагаманіў пісьменьнік. Чутней чуўся водар ейнага цела. Больш яны не хацелі гутарыць.

ІДУЧЫ ДА РАКІ

Яны ня часта думалі пра наступны дзень працы, але вельмі турбаваліся пра намеры і дзеі нядзельным днём. Ды асаблівага ніколі не здаралася тымі днямі адпачынку, бадай сам дзень адпачынку адпачываў.

Пакуль ішлі да ракі, яны (прад гэтым днём таксама) гутарылі пра рыбалоўства, пра паляваньне. Сьцежка да ракі прасьціла па ўзьбярэжжы рэчкі-прытокі зь пяшчаным дном, хоць наўзбочу прасьцінаўся тарфянік. Асака ля аточаных хмызьнякоў лазы, гострая і высокая, астуджаная кропелькамі расы, часам абвіслая на суччу кустоў, мігцела бляскатам зары ці праменьняў сонца. Пад гэткімі кустамі было шмат ціхаты. У невялікіх лукаткахвірох рэчкі плавалі статкам плоткі. Адзін толькі позірк на іхную ўпорастую мільгатню хвастоў, на ўпорастую стойнасьць незварухнёных галовак супраць шпаркага цёку вады ў кажнага рыбальшчыка будзіў рыбацкую парыўнасьць. У тых, што жылі бліжэй да ракі, была свая ахотлівая насалода спадзеву і ўмеласьці. З прыезлых рыбальшчыкаў яны насьміхаліся — ганілі блізу круглы год. Здавалася, што гэтыя далёкія ня ўмелі знаходзіць месцаў злавіць рыбіну ў сваіх родных мясьцінах. А яны былі самыя цярплівыя людзі: калі толькі не на працы — дык за вудаўём з даўгой валасьнёй начэпленай прыманкай. Яны ж па-свойму называлі закуткі ўзьбярэжжаў ракі. Ім прыходзілася ісьці да аблюбаваных прыстанішчаў гадзіну або больш. Дрыжэлі ад сьцюжы і неспадзеўных летніх дажджоў-навальніцаў; знаходзілі мясьціны, дзе лавілася або пацікалася рыба; цярпліва зносілі павучаньні старажылаў зь вёсак на водальных узгорках ад ракі й хлусілі ім, калі тыя пачыналі пасьля парадаў распытвацца пра іншыя дні жыцьця сям'і ці працы. Радзьва рыбальшчыкі зь мястэчка ці гораду заставаліся начаваць каля ракі. Расстаўлялі палатняныя схінішчы, а іншыя, насекшы вецьця лазоўніку й маладога алешніку, абкладалі старыя будкі й запальвалі вогнішчы. Здаралася, ім шчасьціла лоўляй, але заўсёды было й наадварот: рыба бадай лавіла іх. Яны прынукана аставаліся ў блізіне прыроды пад чыстым паветрам, у воддалі абавязкаў прад грамадзтвам і дзяржавай.

Гэткія рыбальшчыкі ўсіх узростаў чуліся маладымі. Ім не было патрэбы прыдумваць жыцьцё — яны былі валадарамі часьлінкаў жыцьця. Яны ўспаміналі на ўзьбярэжжах ракі сваіх родных дзяцей, сваякоў, каханых, але ніколі цяжкасьці працы. Шмат успамінаў аставалася толькі зь імі й дзеля іх. Адвечна завіхное ёсьць жыцьцё! І ў захопе маладосьцяй жыцьця, у зайздрасьці да яго мы старымся, парахнеем.

— Я люблю ноч, — пачаў гутарку сябра Кастуся, — я атарапеў ад сталічнага шуму. А калі быў у пушчы разам з табой, мне чамусьці жадалася хутчэй канца вайны і апынуцца ў гэтым шуме, у мітусьні, і нават у неразважным захаваньні...

— ...а я казаў: асьцепяніся, падумай, бо, здаецца, ты яшчэ ня меў прызвычаю ахінуцца жыцьцём сталіцы, а я перад вайной жыў там. Дык цяпер не барджу туды.

— Мо' ад таго, што мне прыходзілася ўвесь час быць на першых сутычках зь немцамі, поўных стральбы й крыкаў параненых, ніколі нявыспаным... Памятаеш, як Вацюха, камандзер лыжнае брыгады, камандаваў праз ганцоў: — Забраць мястэчка! — Сьмерць здраднікам!.. — Вось тады зажадалася мне сталічнага шуму, адпачыць у гэтым шуме, быць у цяпле людзкой кватэры... Я ніколі, пакуль жыву, не забудуся пра вайну...

— ...няўжо вайна зь немцамі бы пасткі твайго будучага жыцьця?

— Ня ведаю, як сказаць. Калі я абуджаюся ад сну, мне адразу чамусьці б'е да слыху й да сэрца вайсковая шумятня, але яна палохае цяпер вобразам працы. Я — працавіты чалавек, і вось праца палохае мяне — крадзецца да адчуваньняў палоскамі жорсткасьці на вайне...

— ...я разумею цябе. Ты быццам зноў мабілізаваны ваяваць.

— Не! Ты не разумеш мяне... Дазволь успомніць табе, калі змагаліся за тое мястэчка, я, уварваўшыся туды першым, напаткаў хлапчука год мо' каля трох. Ён, бадай, грэўся каля пажарышча. Я падхапіў яго на ўлоньне. Мне тады было толькі дваццаць год. Я пачаў плакаць, гладзіць ягонае паўголае цела; ён прытуліўся да мяне, маленькай далоняй плешча каля вуха, сьмяецца, а я плачу, ўсім маім целам.

— Чаго, дзядзя, плачаш? — пытаецца ён, і я тады прыпаў да зямлі й цалаваў яе, хінуў дзіцё рабіць гэта самае... Дурань я! Няпраўда?

— …таму што ты нэрвовы быў. Усялякая сучаснасьць патрабуе нэрваў. Я ведаю, што такое нэрвы. І нэрвы былі патрэбныя ў мінуласьці й неабходныя ў сучаснасьці.

— ...о-о-о! Ты хочаш сказаць, што яўнасьць заўсёды ў дастатку ад ранейшага, так ці не?

— Не-е! Я кажу, што ты нэрвовы і нэрвова разумееш сучаснасьць.

—...не! у цябе ўсё нэрвова ад твайго ранейшага. Ад 1941 году да 1944-га ты змагаўся, кідаў сябе ў небясьпеку, таму табе ўсялякая несправядлівасьць у пасьлявайсковы час здаецца найбольшай несправядлівасьцяй. Ты хочаш усё рабіць на пралом галавы... а цяпер няма вайны. Ты мусіш паважаць пашану правадыром. Краіна ў стане міру цяпер.

— Дазволь! Бадай не па сэнсе адказваю. Пра мінулых правадыроў ня будзем гаварыць, але сучасныя ўсялякімі правакацыямі, дзяржаўнымі мудрасьцямі прывучаюць народ... ды вось народ гаворыць пра гэта, як пра здарэньне або як анэкдот, бяз дробкі патрэбы адчуваньня захапленьня імі, бо патрыятызм прыходзіць сам, калі Айчына ў небясьпецы. Народ верыць тады сваім генэралам, а дзяржаўныя правадыры надалей — адно памяць, бы пра нейкіх артыстаў... Наагул увесь сьвет у раздвоі — шмат людзей захоўваюцца, як піраты...

— ...вам трэба зноў прачытаць творы Эрэнбурга. Ён навучыць разумець нашую сучаснасьць.

— Гэта — быццам кінуць электрычную лямпку, каб яна дзесьці сьвяцілася бяз доступу электратоку... Я — журналісты, і вам сорам казаць, каб я ня чытаў Ільлю Эрэнбурга. Ён — чалавек-пісьменьнік, што ня мае прытомнасьці сказаць: — Я гавару разумна, можа праўду, але верыць мне ня трэба, бо я хлушу...

— ...вы ўсё адмаўляеце.

— Адмаўленьне — пайбольшая справеднасьць. Адмаўляць значыць: я хачу ведаць або перажыць усё, чым жыву, і яно ёсьць ня гэтак, як патрэбна... — Ня кожная існасьць можа аставацца ў часе асновай сваёй існасьці. Вы даруйце мне, што я пачынаю гаварыць ня гэтакай імітацыяй, як вам падабаецца. Я жадаю крыху сьцягнуць нашую папярэднюю гутарку ў магчымую неабходнасьць: — Што, па-вашаму, ёсьць ненармальным на гэтым сьвеце, а што ёсьць нармальным?

— Я ўторавую вядомае: я — журналіст, таму ненармальная зьява для мяне, калі я ствараю для будучыні, бо найлепш ствараць для цяпершчыны, цяпершчына ўсё'дна застаецца мінуўшчынай, а зь мінуўшчыны прыходзіць будучыня...

— ...тады вельмі сур'ёзна прачытайце ўсяго Максіма Горкага. У пісьмах ён успамінае Янку Купалу.

— Янку Купалу ўспамінае, бы хлапца-зладзея ў Расеі, і павучае яго, як быць накладачом дзеля нейчай свабоды, а не дзеля сваёй нацыі...

— ...Янка Купала быў стваральнік міру.

— Купала — змагар за свабоду й жыцьцё роднае Айчыны, за лёс свае нацыі... А мір? Мір, мой брахначка, ёсьць уцеха — загадка валадарцаў над пераможнымі. Па-мойму, найвыдатнейшыя стваральнікі міру на зямлі — гэта мы. Называюць нас у пісаньнях працоўнымі... Мы нагароду міру не выдаём і не атрымоўваем, бо нашы цягліцы ў міру ад цяжкае працы. Мы — самыя багатыя ад беднасьці. Што маем, можам ахаваць мірам-потам дружнае працы...

— ...валей, ня будзем гаварыць пра «запацелае». Гэтае слова заўсёды любіў казаць Трыха. Памятаеш яго? Загінуў бядача, і то, калі пасьля вайны п'яным пад дарожны трамбавік зваліўся — спрасавала ўсяго.

— Слаўны чалавек быў, але я не любіў яго.

— Не любіў і я, але ўсё хай будзе зь ім.

— Я пагарджаў ім за хлусьню.

— Пра гэта ня ведаю.

— Мір ягонаму целу! А немцаў ён перабіў нямала — па пальцах ня зьлічыш.

* * *

За прагалінай хмызьняку знаходзіўся рум. Падчас зімы сяляне навазілі туды праслы хвояў, елак і іншае дравяніны. Там, дзе ляжалі абскробленыя хвоі й елкі, вадрыла пахам жывіцы. У саматканай кашулі каля сьцежкі на самай вышэйшай вярсьце зь бярозавых чуркоў сядзеў вартавы.

— Добрай раніцы, Хвядось! — прывітаўся Кастусёў сябра. — Вартуеш?

Вартавы не прамовіў слова ў адказ, але кіўнуў прыветна галавой. Пачаў глядзець не на рыбальшчыкаў, а на шырыню руму. Кастусь спакмеціў у вартавога прыкорчаную пясьць, і на ёй не ставала трох пальцаў. Гэтай скалечанай рукой ён падгроб паляўнічую стрэльбу-аднабойку, памалу ўзьняўся, азірнуўся на рыбальшчыкаў позіркам, быццам гэтым ён хацеў вырваць із свае душы нешта балючае, пакутнае разам зь ім на ўсё жыцьцё, і кінуць ім усьлед аб'явістым, як рэч. Пайшоў па бярозавай вярсьце ў бок шыркоў руму. Ён быў нізкарослы, з капой сівых валасоў. Прызвычайна ступаў з аднаго кругляка на другі. Сонца ўзьнялося невысока. У водсьвеце праменьняў ягоная палатняная кашуля бялелася найчысьцейшай бельлю бярозавых круглякоў і абскобленых вершакоў хвояў і елак.

— Сяргей, ён ходзіць па вёрстах дравяніны, бы па свайму двару. Люблю гэтакіх людзей!

Сяргей усьміхнуўся, блізу вокметна, упільнавана — толькі дзеля сяброўства ён можа зносіць гэтакую думку пра вартавога руму. Суха кашлянуў. Азірнуўся на вартавога. Загаварыў голасам клапатлівым.

— Ён жыве ў зямлянках ужо блізу дваццаць год. Адну збудаваў там, — Сяргей паказаў на ўзьбярэжныя вярхоўі каля ракі, зарослыя пушчай. — Натварыў дзяцей там, а другую — дзеля сябе выкапаў тут... Барацьба за жыцьцё, сапраўдная барацьба! У гэтай, што на руме, жыве сам, і зарабляе колькі дзясяткаў рублёў на пражытак сям'і. А не стае грошы, ведаеш як жыве? Пушча й рака накормяць і апрануць. У гэтых мясьцінах усё памагае чалавеку.

— У зямлянках вохка — я не люблю ўспамінаць пра іх.

— Вохка? — перапытаўся Сяргей і засьмяяўся ўсімі глыбкамі грудзей. — А нам што? Хай жыве!.. А між іншым, ягоная сям'я — мае старыя знаёмыя.

— Якая ўрэзьлівасьць у нашай мове: старыя знаё-ё-мы-я!

— Бо знаёмыя! Навошта пераскокваць тое, што не пераскочыш? Непаважаньне ёсьць нянавісьць. Здаецца, ён, — Сяргей паказаў поўным узмахам рукі на вартавога руму, — не злуецца на мяне. А злавацца ёсьць за што. Я... можа ты чуў тады ад партызанаў, расстрэліў ягоную дачку? Ні сам, папраўдзе, дык па загаду...

— Напэўна, яна была маладая, бо ён не выглядае старым?

— Ёй было тады сямнаццаць гадоў, узрост, калі людзі тоесёе могуць думаць і самастойна рабіць. Ня бойся — умела ж браць мяне пад руку і жаночым позіркам, бадай стрыгла, азірала мяне... але яна адмовілася падкласьці міну пад мост.

— А чаму сам не падклаў?

— Для мяне было небясьпечна. Я ўжо быў змагар, а яна нічога, звычайная сялянка, з мізэрнымі заслугамі — занесла некалькі разоў нашу прапаганду немцам.

— Дык вось яна, сялянка, і ведала, як класьці ягады ў кашолку і прапаганду, але ня міну.

— Магчыма... Не! Валей ня будзем успамінаць пра вайну — там былі загады.

— Дзякую! Давай — ня будзем... Але ўспаміны адвечныя загады супроць несправядлівасьці...

Іхныя знаёмыя ішлі далёка наўперадзе. Яны ўжо дайшлі да ракі. У воддальку, над прасьцягом рачных старыцаў, круціліся памальным лётам каршакі-рыбальшчыкі. Іхны колер безузмашных крылаў быў чарнейшы за ўсё ў краявідзе, асьвечаны бражовым сьвятлом летняе раніцы. Знаёмыя гурміліся каля

рэчкі, па ўзьбярэжжу, што ўвесь час ішлі, а якая спаткаўшыся, шпарка, зьлівалася з плыняй ракі. Там, у зьліве, плавала шмат дробнай рыбы. Знаёмыя зацягвалі намёт налавіць жыўцоў.

— Ты гэтым летам рэдка прыяжджаеш да мяне.

— А як? Часта дажджы былі, — адказаў Кастусь і азірнуўся на рум. — А ты калі прыедзеш да мяне?

— Буду прыяжджаць... А ты што — усё вучысься завочна?

— І не барджу канчаць. Маю прычыну атрымаць лішнія дні адпачынку... а потым, сам ведаеш: хачу сустракаць яе. Кахаю! Калі ад'яжджала на эстрадныя канцэрты, хвалілася шчыра: — Я магу кахаць толькі мужчын з тваім характарам. — Сьмяялася, хадзіла перад мной у купальным касьцюме... Кожную шмату-адзежыну атрэсвала бадай ад грэху й пылу, дый памалу складвала падарожныя валізы. Не бяз посьпеху выступае яна на эстрадзе: сьпявае, танцуе.

— А я раджу табе: не жаніся зь ёй.

— Пагутарым потым пра яе... А цяпер я перайду рэчку і пайду да свайго месца.

— Зноў безь мяне?

— Люблю рыбу лавіць адзіночна, — адказаў Кастусь і закасаў хутка нагавіцы, пайшоў да рэчкі. — Застануся начаваць на лузе. Пагаворым пра яе перад ад'ездам.

Ягоны намер быў неспадзеўны для Сяргея.

— Добрага лова!

— Добрага й табе, — адказаў Кастусь і пайшоў лавіць рыбу да раней вядомага месца на рацэ. Яму сталася вясёла ад чыстага паветра й ад гутаркі сябры. Гэта была непадробленая праўда іх абаіх. Адчыненая глыбіня людзкое душы, якая яшчэ не апастылела ім. Зь імі аставалася суравасьць — неахайныя адведкі саміх сябе — успамінамі. І гэта не была споведзь, каб ускроснуць ці збавіцца ад неспадзеўнага ў жыцьці. Імі адчувалася і разумелася, што рыштаваньні з палосак нэрваў маглі ня вытрымаць, калі хто наступіць на іх, як на чарвяка, і хто-небудзь не палянуецца апусьціцца, нат' у продань, каб раструшыць цябе.

А калі закінуў вуду ў спакойны чорны вір, Кастусь пачаў думаць зноў пра жанчыну, што, як трысьцё на ўзьбярэжжы каля яго, шарахнела шоўкам сукенкі, уваходзячы да ягонага пакою на Нямізе. Яна адразу скідвала чаравікі каля ўваходу; і гутарка ейная была поўная жаночых спадзеваў пешчаў ды жаданьняў. Усё іншае, што гаварылася перад гэтым, ідучы да ракі, зьнікла з думак. Гэта была толькі гутарка, бы знаходжаньне добрага часу для адпачынку.

СПАТКАНЬНЯ

Калёсы дрыгалі па калюгах. Сусед-старэча падчас гутаркі кашляў радзьвым, працяглівым кашлям. Іншы раз было цяжка пазнаць, ці кашляў ён, ці гэтак голасна-хлёбна драгаліся ў каўдабіны калёсы.

Я пазіраў на яго. Мне было ўсёдна, што ён і пра што ён казаў. Радасьць пабыць дома, дзе нарадзіўся, была вялікая. За кілямэтар перад вёскай ён зьлез з возу. Я ведаў чаму, аджа, зрабіць тое самае я не зьбіраўся, думаў: — Хай конь вядзе, — і я ўпёрся ў пярэдніцу цялегі нагамі. Конь упораста, бадай вылазячы з вопражы, цягнуў і стрымоваў цялегу ў скручастых выймах дарогі ў сярэдзіне ручая. Сусед ішоў па кладках. — Чаму ня сесьці на цялегу, — спытаўся я. Ён махнуў рукой.

— Тарахву капаюць, яміны на балоце робяць, а загаціць ручаі не дадумаюць. А загаціўшы іх-х... Ах, сынку, ты хоць і вучоны, не дадумаесься, колькі б хлеба намалолі б яны і лекстрыкі насьвяцілі нам... Ты ж азірніся — яны ж як сьвечкі сьвецяцца.

Я азірнуўся. Пяшчасты жаўцяк у ручаі сьвяціўся ад пасьмаў вячорнага сонца.

— Можа, улетку перасыхае?

Ён нядбайліва пытаецца:

— Ці высыхаў, калі быў і жыў з намі?

— Здаецца — ніколі, — адказваю я.

— Но-о, касьцянявая! — скрыкнуў ён на каня і неспадзеўна (я хацеў памагчы яму) успрысеў на калёсы. Ажно да самай сялібы, дзе я нарадзіўся, ён прасядзеў на пярэчане возу. Больш нічога не гаварыў, нават не паглядзеў на мяне, калі я, удзячны яму, і барзьдзіў абняць маму ды меншага брата. Мне потым падумалася пра яго. Які ён упорасты і шчыры дзядок; за ім было жыцьцё, і яно было перад ім цяпер, але што меркаваў калісьці, не жадаў перамяніць. Ён, бачна, чакаў, што ягонае жыцьцё штосьці зь ягоных намераў зловіць. І вось, бадай, колькі асталося жыць?

Дамоўка-сьмерць ня ўніміць яго. Жаданьні: скарыць ручаі, поўнае крынічнае вады, што закруцяць жорны ў млыне і асьвецяць «лекстрыкай» вёску, яшчэ жывілі яго.

— Добра, што не спытаўся, колькі заплаціць, што падвёз цябе. Быў бы крыўдны аж да Калядаў, — сказала назаўтрае мама. Але чаму да Калядаў крыўдаваў бы ён, я не спытаўся яе. Я ўжо забыўся на яго. Навошта памятаць тое, што нічога не прынясе новага ні сяньня, ні заўтра? Гэта ж усяго ад учарайшага дня толькі рэха. Я хачу адпачыць, убачыцца з былымі сябрамі. Я пачынаю адчуваць: мая маладосьць зьнікае па крыху. А каб супраціўляцца старасьці, патрэбна хоць кропельку лішняе моцы працівіцца ёй. І ўяўленьня ажыць моцай, было ятрыстае жаданьне забыцца пра ўсе мінулае. Мінулага ў мяне ня шмат, але што прылучалася, ужо было вельмі квялістае й злосна-незразумелае. Я ня ведаў, у чым я справядлівы й дадумны, у чым толькі захоўваюся пужліва-асьцярожным. Якая задорлівасьць ад цьвялістасьці, ці ад непагоджаньня з абыдзённымі ўмовамі жыцьця. Я вёў сябе па незнаёмых сьцяжынках існаваньня. Слухаць кагосьці (я памыляюся, вядома) ёсьць адно чутка, якую можа нехта ня толькі пачуў, але й пераважыў усёй сьвядомасьцяй сьвядомага асудку ды адчуваньня. Аднак у тым асудку, я пераканаўся, ёсьць пытлівасьць часу й момант здарэньня, які ў некаторых выпадках мог перад кімсьці апынуцца шорахам крокаў на начной вуліцы, або нат' злом усім-усяму. Самае цяжкае — зразумець цяжкое ў жыцьці, а тады ўжо камусьці перасьцярога: — Ня тыцкай сьвятымі імёнамі й падзеямі. — Кажны можа быць сьвятым і дзеля сябе, і дзеля іншых! — Настрой і жаданьні чалавека — найбольшае, чымсьці сам чалавек, як постаць спакмень. — Пазбавіцца чалавеку ад імкненнасьці да дабра можна толькі раз: калі памірае ў ходаньні за яго. Але Дабро й уселякая Справядлівасьць — мернасьць, уціхаміраны пакорнік, што ўціхамірвае парываньні пакрыўджаных у жаданьнях... — Усё гэта — адвечны ручай, стрыманы бярэжжам або прыпынены гацяй!

...Мама пайшла на працу. У вёсцы і ў сялібе нашай вусьціш. Сонца поўна ўсюды. Вадрыць цьвіценьням ліпаў. Сьцень каля ліпаў у велічыню іхнай размашнасьці галінаў. Далей ад іх пачынаўся муражаны луг. Я люблю — і паважаў заўсёды — прылегчы ў муражанай траве. Іду туды. За варотамі на вуліцы спатыкаюся з тым сяльчанінам, пра якога казаў мне сусед, везучы мяне зь мястэчка, і таксама казала мама.

— Уцешна спаткацца з вамі!

— Вітаю вас! Даўно, даўно бачыліся, — адказваю я.

— Але, але — напраўду даўно! — заўважае ён, працягваючы руку паздаровацца.

Усьміхаюся яму ўсёй шчырасьцяй сэрца й настрою.

— Гультаеш, а? — пытаецца ён.

Зноў усьміхаюся.

— Тады адпачываем... Можа, хочаце прайсьціся да возера? — запрашае ён.

— Калі ласка — з ахвотай, — згаджаюся я.

Мне больш ня трэба гутарыць. Слухаю яго. Ён у шэрым касьцюме, з акулярамі, крыху асуненымі на сярэдзіну носу ад спацеласьці. Заўважаю, яны пад колер ягонага твару. Валасы й касьцюм таксама блізкія па колеру.

— Ня сумна? — і адказвае за мяне: — Але ж учора прыехаў — чаго сумаваць?

Усьміхаюся зноў. Ад згоды кіўнуў галавой.

— А мне дык сумна ўжо. Тры тыдні жыву тут. Даведаўся, што бацька твой памёр.

Працягвае руку.

— Мае спачуваньні. Чалавек слаўны быў, і няма што казаць? — няма.

Адварочваецца адразу ад мяне. Ня ведаю, ці спакмеціў мой той самы моўкны змах галавы, маю ўдзячнасьць за спачуваньня.

— Уначы, прад вашым прыездам, тут навальніца была. Хлеў не спаліла ў майго суседа, а курэй усіх пабіла. Да аднае пабіла! Пер'я ажно на мой ганак нагнала... А сяньня, раніцай, у канцавога Міхаля карова нагу зламала, і то дзе, на выгане. Кажуць, страхоўку не атрымае. Я парадзіў здаць карову дзяржаве ў лік здачы мяса ад сялібы. Шкадую гэтакіх людзей... А ў самога мяне панчохі стапталіся, а купіць ня пытайся. Хаджу без панчохаў, добра, што чаравікі новыя купіў.

Ён задзёр штаніны на абодных галёнках.

— Нешчасьце, — кажу я.

— Дзякую! Не турбуйцеся.

Мае гострыя на слых вушы чуюць, як ягоныя без панчохаў ступні хлёпаюць у нятуга зашнураваных чаравіках. Мы йдзём, хто яго ведае куды, мы йдзём, мо' да возера, мо' да лесу. Прырода навокал нас бы бяры яе, бы яна багаславіць тэй п'янасьцяй, ад якой заўсёды чамусьці верыцца, ты будзеш жыць тысячу год. Неба адно праўдзівасьць зямнога часу. Імкніся кажны й кожнае на зямлі, да нейкіх часінаў, у якіх будзе ўсё невядомае або не перажытае яшчэ, сапраўдным сном!

Дзесьці далёка, у прасьцінку лесу, чулася рэха пастуховай жалейкі. Яно аднолькава гучэла ў прасторы паміж зямлёй і небам. Дзяціныя скрыкі вясёлыя, усюды ў наваколь́лі, адоньліва зпляталіся з гукамі жалейкі. У водшыбе ад селавой дарогі на гнязьдзе, што на высокай елцы, заклекаталі буслы; яны, бадай, адны побач нас дваіх зразумелі прылуку прыгажосьці лета ў вёсцы й наваколь́лі. І гэта было праўдай, ад якой прыходзяць адчуваньні й уражаньні чалавеку, праўдай жаданьням штосьці выдумаць сабе прыгожа-любага ў жыцьці.

— Меру ведаюць, — сказаў мой вясковец, і прыпыніўся, пазіраючы на гняздо.

— Кажнаю раніцу, і ўвечары, цешуся іхным клёкатам.

Адварочваецца ад мяне, але не ідзе. Бы перахрысьціцца, змахвае правіцай са сьцісьненымі пальцамі.

— Адно прамежкі часу паміж іхнымі тахканьнямі колькі значаць мне. Мне робіцца тады чамусьці страшна. Страшна нават чуць іншыя гукі й шорахі. Мне здаецца, клёкатам яны хочуць гаварыць да мяне... Ах, якія імгненнасьці! Ды не — ня будзем гаварыць пра птушак. Хадзем, калі ласка!.. Вам не мяркуецца, што я гавару шмат?

— Не! З прыемнасьцяй слухаю.

— Ня трэба слухаць. Уравайцеся гутаркай.

— Дзякую — гутарыце! У вас болей уражаньняў — вы ж раней прыехалі сюды.

— Не хлусіце... Аднак даруйце: мы ж даўно ня бачыліся. Вы ўжо дарослы. За вамі спэцыяльнасьць, калі не памыляюся, праўнікам захацелі быць... Добра. Вельмі добра. Каму ж небудзь ды трэба сьледкаваць за правам... Ах, не! Я памыліўся: за справядлівасьцяй, бо ж справядлівасьць — маці дабра й праўды й права... А ў права я ня веру. Яно ці не кажнойчы мкне, як цягнік, ад аднае станцыі да другой: прыпыніцца на паўпрыстанку, завернецца на вялікім разьезьдзе. Адно грукат рэяк, і дым. Дым сьведчаньня сьведак — сыгналы: ехаць ці ня ехаць. А машыністы не вінавайца й не абаронца. Машыністы — пакараны віноўнік. Але чаму я сказаў гэтак, ня ведаю. У чалавека поўна розных думак. Пра абыдзённае жыцьцё чалавек мусіць думаць сапраўднасьцяй, тады сапраўднасьць будзе філазофіяй і асуджэньням-крытыкай...

Я зноў усьміхаюся. Цікава быць зь ім. Мой усьмех, напэўна, перарваў і ягоныя думкі.

— У вас жыве вялікі духовы інтарэс, хвалю яго.

Ён не задавальняецца.

— Ня трэба хваліць мяне. Я нікога не ўваскрасіў і не ўкрыжаваў маімі казаньнямі. Я мо' звычайна захацеў пагаварыць. Я ўсё жыцьцё слухаю. Ах, не! Даруйце! Я гавару, выступаю. У прамовах абяцаю ўсё, што мне абяцаюць іншыя людзі, і ад тых абяцаньняў прынуканы ня думаць па-свойску... О-о, што я гавару! Я злодзей вашага дня. Першага дня вашага адпачынку. А дзень сяньня цудоўны... Будзьце асьцярожныя, ніколі не кажэце: дзень сяньня цудоўны — валей торыце: дзень удаўся мне.

Ён змоўк. Я скрадна паглядзеў на ягонае аблічча, поўнае нейкай пакрыўджанай, схаванай тайніцы. Яно было дзяціннае. Прасьліны валасоў асунуліся ледзь-ледзь рэдка на вушы. Постаць была паўпрыгнутая, здавалася, ён ня дыхаў, каб толькі ня выдаць неўціхамірную жасьць жаданьня пагаварыць. Я ўжо разумеў гэткія скрадкі пачуцьцяў — яны ня вельмі зракаліся сваіх турботаў.

Абапіраюся на плот, за якім барозны бульбы. Роўнасьць барознаў парушае зацьвіцелы асот. Мне вальней на сэрцы. Ён таксама абапіраецца на плот, падпіраючы абедзьвюма далонямі твар. Я поўным позіркам азірнуў яго. Добра, што не сказаў: «трэба йсьці» — падумаў я. І ён зьдзіўлена, бы адчуваючы мой намер, пабардзіў.

— Хадзем. Ня наша ўласнасьць — навошта азіраць яе?

Ён упершыню ўсьміхаўся ўсьмехам бяздонным і недаўмелым. Ён пайшоў першым. У ягоным хаджэньні была лёгкасьць і захоўнасьць чалавека рухацца шырокімі павольнымі крокамі. Мне нават не паверылася, што ў ім жыў імпэт хутка перамяньваць думкі й гэтак павольна хадзіць ступкамі цьвярдымі й, бадай, адмеранымі. Аднак я паверыў: ён камусьці мілы й патрэбны. Я ўспомніў свайго колішняга настаўніка, зь якім таксама некалісьці прайшоўся аж за мястэчка й таксама наслухаўся ад яго зусім неспадзеўнага й незразумелага. Цяпер я шмат што разумеў у жыцьці. Прыймаў удзел у ім, не як бы які вучань, а з адказнасьцяй за свае ўчынкі й дзеі. Але, спаткаўшыся з сваім вяскоўцам, які таксама прынёс мне мітусьню ў маю штодзённасьць — адразу стаўся мне незразумелым. Прынамсі, настаўнік у гутарцы са мною не хаваў сваіх думак і адчуваньняў пра жыцьцё, пра якое тады я нат' і ня думаў, што яно штосьці большае чымсьці ты існуеш, або цябе няма. Я разумеў тады зусім проста: чалавек ёсьць — жыве, няма, — памёр, ад хваробы памёр. Гэты ж чалавек, мой вясковец, у якога не пытаюся, што і дзе працуе, я спаткаў зусім іншае. Ён, бы саромеецца жыцьця, бы як рыбіна плавае ў ім, тоіць дабрароднасьць: злаві мяне — насыцісься. У ім ці не жыве сьціпласьць.

— Можа, палудняваем разам? — пытаюся я, усё па-ранейшаму ня ведаю, як пачаць гаварыць зь ім.

— Дзякую! Я мала ем: сьнеданьня й вячэру.

— Шкадую, — адказваю яму. Мне крыху робіцца ненатва ад ягонай кампаніі.

— Прабачце мне. Я раскажу вам пра іншае, не пра спажыву Боскую. За дзень прад вашым прыездам я прапанаваў лекцыю сялянам з двух вёсак. Яны сабраліся. Я дакладаў ім, як усялякія віды на зямлі мяняюцца ад малпы аж да чалавека...

— Ім было цікава, — наўмерана, умешваюся ў гутарку — пахваліць хочацца.

— Я ня буду доўга — адно паслухайце, як гэта азорліва, спытаўся ў мяне селянін, ты яго ведаеш, ён адвечна бедным быў і цяпер гэтакім ёсьць. Але на дзяцей багаты, як дзяржаўныя аблігацыі — усе дзевяць хлапцы...

— Дык хоць у адным дый выйграе, — жартую я.

— Няхай растуць. Я размаўляў зь імі — разумнейшыя за бацьку. Але падчас дакладу бацька іхны спытаўся ў мяне: «Конь, даручаны мне, гэтакі зараза, што не палянуецца ўкусіць мяне, калі кладу аброць на яго, а плуг цягнуць лянуецца, дык вось, таварыш, скажэце: можна яго зь вялікага каня ў сабаку перамяніць ці не?»

— Цікавае пытаньня, — кажу я і быццам так сабе прыкусваю вусны, хаваю ўсьмешку.

— А вось я не зьбянтэжыўся. Каб не адмаўляць Дарвіна, я адказаў яму, што можна перамяніць каня ў сабаку, калі толькі ня здохне гэты конь ад працы ці ад перажытага конскага веку.

— Вельмі разумна адказалі.

— Дзякую!

Мы праходзілі цяпер каля лазьні. Яна стаяла на бярэжжы ручая, што ўпадаў у возера, да якога якраз наўмераваліся ісьці. Гэты ручай і стварыў возера, калі яго загацілі высокай пяшчанай грэбляй.

— Калісьці тут, у лазьні, мыўся разам з вамі, памятаеце?

— Памятаю, — адказваю пэўна, але папраўдзе, я ня памятаю. Я ніколі ў гэтай лазьні ня мыўся. Я толькі любіў, калі жыў у вёсцы, падлеткам, азіраць вераб'ёвыя гнёзды і калыхацца, зьвязаўшы галіны паркавых бярозаў, што расьлі навокал лазьні ў два шэрагі. Іх пасадзіў мой прашчур-прабаб. Я ведаў гэта і зайздросна трымаў у маленьскім сэрцы ягоную працу-спадак. Я азіраў іхны зялёны высокі ў росьце спакой, толькі ад адолу іхныя галіны краталіся ад лянівага летніка. Галіны ляжалі аж

на зямлі. Я ня мог утрымацца, падышоў бліжэй, завязаў іх вузлом, размашыста махнуў.

— Хадзем, — ён кліча мяне з воддалі. — Нам трэба ісьці.

Я скрыта зьдзіўлёны ягоным захаваньням, але аддаюся ягонай волі. Ці варта зьдзіўляцца або крыўдзіцца? Ён пачаў гутарку з чароўным настроям і зь іншым захаваньням. Быццам ягоны сын ці па працы ад яго залежны, трымаюся шчырай пашаны. — «Няхай гаворыць, мне будзе прыемна ўспамінаць сваё? Каля возера я ўхілюся яго», — падумаў я.

— Тое, што я раскажу вам, цяпер ня будзе дзівацкім. Я адчуваю: вы падумалі — аджа зь дзіваком спаткаўся. А геніі таксама дзівакі. У іх шмат дурнотаў, але іхныя дурноты любяць насьледаваць, як усё іхнае геніяльнае, зь верай, што яно вялікае, няўторнае...

— Навошта крыўдзіць сябе? — заўважаю я, але так, каб толькі заўважыць.

— Ах, нічога! Не находзьце ўва мне пагаблевасьць.

Я зноў азірнуў яго. Ён быў увесь у цепрасьці пагутарыць, пагутарыць пра сваё.

— Аднойчы, — пачаў ён, — у лазьні зьявіліся чэрці, сапраўдныя чэрці. Колькі іх было, ня ведаю, але яны іграліі, а можа, толькі адзін іграў, не па-люцыпараўску. Ведаў, што чэрці непрыгожыя, брыдкія, а вось ігра іхная чаравала мяне і вабіла мо' іншых таксама. Але аднойчы яны зьніклі з лазьні, мне самому давялося бачыць, як пахмурнай раніцай яны кінулі лазьню. Ішлі да лесу шарэнгай, у чорнай вопратцы і былі падобныя тады не да чартоў, а да людзей. Я ніколі не забудуся гэтай скратнай, люцыпараўскай паходні да лесу. Яны, здаецца, не ішлі, а пілавалі паветра, іхныя крокі-ступні былі апілаваньні ад паветра. Я часам думаю: у Беларусі чэрці жылі ў казках, ці мо' ў душы кажнага беларуса. Але пакуль вы дадумаецеся сказаць мне, што гэта толькі байкі-выдумкі, я пабарджу наўмеціць вам, што чарты непрыгожыя, але йграюць прывабліва.

У іхнай ігры нейкі заўсёдны запавет, аднак які: люцыпараўскі ці Боскі — ня ведаю. Адно я ведаю, калі змагаюцца вялікія дзяржавы за маленькія — чарты супроць чартоў, дык вялікія ў люстэрку маленькімі бачаць. Яны трасуць, музычуць нядоляй іхнай, каб толькі, як селянін утоптвае, трасе піхцер — утрасьці да сваёй дзяржавы скубень тэй нядолі нашай.

Я зноў зірнуў на яго. Нашы позіркі сустрэліся. Я пазяхнуў.

— Ніколі не пазяхайце каля бяседніка. Падумае: чалавек дробнага розуму.

— А гэта ня ваша справа навучаць мяне, — языкавата адказаў я.

— Даруйце мне! Не навучаю, не прыгнебліваю.

Яму ня варта ведаць, як я магу спрачацца. Хай верыць — мне няма чаго адказаць. Гляджу на скрай летняга неба зь вельмі рэдкімі хмарамі, яны, бадай, расьцісьненыя азяровасьцяй узвышшы. Ад гэтае азяровасьці, здавалася, паверхня зямлі кідала ўсё, што магло быць каляровым і азначаным на ейнай зьверхні. Я не азіраў пярэстасьць прыроды воблікам мілага адчуваньня, а прычынай, якая прынукала спаткацца із вяскоўцам, і гэта апошняе найбольш авалодвала маім сэрцам ды думкамі. Я гутарыў з самім сабой. Дзеля паказу свае прыстойнасьці мой знаёмы аднавясковец не перашкаджае мне. Няхай думае: я захапляюся ім, радуюся ягонай прысутнасьцяй у блізіне мяне! Тут ня цесна нам. Усё навокал нас — прасторліва, — думаў я. Ад рознага, што пачуў, я каждую думку астаўляў сабой, часам закончаную, а часам тым самым ушчалопкам, каля якога праходзіў або мімавольна спатыкаў. Кажная складка зямлі, кажны куст ці заросьля аднолькавых дрэваў была сьвядомасьцяй неабвешчанай мудрасьці, але якая не патрабавала меры падобнасьці да чагосьці іншага, а ўзгадвала кароткую яснасьць прылукі, якая, можа, ніколі ня кончыцца ў здарэньнях нечаканых прычынаў ды ўражаньняў. Прычыны нараджаюць векавістасьць; аднак уражаньні нараджаюць прычыны-прычынаў ад рэчы й дзеяў, і заўсёды яны спыняюцца культурай і, апрача сымбалю, ніколі не пашлюць чалавека да вышэйшай меры адчуваньня, чымсьці ягонае існаваньне, пакуль жыве. Яны скоўваюць яго мамэнтам патрэбы дзеля сучаснага, але ня будучага. Будучае — сьлед мінулага, і тым часам зьбежнасьць зь мінулым дзеля ненавіснага мінулага...

...мы ішлі па вазёрнаму ўзьбярэжжу. За кустом лазы ляжала маладая жанчына, запальвалася пад сонцам. Грудзі выставіла сонечным праменьням неахінёнымі. Яна не пачула нас. Мінулі яе. Мы йшлі па тарфяным, высушаным узьбярэжжы, яно не было чутнае пад ступкамі. Ейныя грудзі паўнатой вытаркнуты стаялі ў маіх вачох, бы жук з расталенамі сігавіцамі. Завярнуўшыся за сьцень высокіх вольхаў, вясковец спыніў мяне.

— Я далей не пайду з вамі, — і ён узяў мяне пад локаць, ягоныя вочы, бадай бязрушныя коркавыя паплаўкі, глядзяць у мяне. — Адно скажэце — даруйце, што неспадзеўна! Вы праўнік, мусіце ведаць: калі судзяць, дык судзяць па ўсіх артыкулах кодэксу, ці мо' толькі па адным артыкуле?

— Вам дастанецца аднаго артыкулу адчуць, калі толькі асудзяць за што-небудзь, — адказваю я.

— Дзякую!

Мо' здалося, ён рэзка адпускае мой падлокаць, і тады больш падступна, у блізіне мяне:

— Праз тыдзень я паеду ад вас, з маёй вёскі... Ах, не — пройдземся крыху!..

Мы пайшлі ў прасьцінку да вазёрнай гаці. Ён моўкнуў, моўкнуў і я, але думаў пра яго. Што за чалавек ён? Ці пасьпеў ён для нейкага грэху? Для нейкага дабра ці зла? Ці ён пасьля некае дзяржаўнае дысцыпліны, пасьля трох тыдняў жыцьця ў вёсцы на вольным паветры неспадзеўна адчуў раптоўнасьць, адзінотнасьці й непрынукі, зажадаў пагаварыць пра ўсё існае і пра ўсё, што толькі зналусна кранула яго дадумнасьцяй і даўціпнасьцяй? Можа, ён, ніколі прад гэтым не назіраючы прыроды, але ўвесь адолены гурмой людзей па працы, ня думаў, што ёсьць іншыя людзі, ёсьць іншыя працы іхныя — нечакана ўсьвятазораў у прыродзе, у людзях штосьці шчаснае, узьніклівае ў штодзённым існаваньні? Я ня ведаю, што адказаць самому сабе. Я сам маладзеў сярод спрадвечнага, шчырага дару летняга навакольля.

Ён зноў спыніў мяне. Навошта думаць пра яго? Ён сам думае пра сябе. На ягоным абліччы прыгожае маленства, і чароўны, крыху дзеля сябе ўстаёны круг у вачох. З-пад маіх ног прыгнула невялікая люгашка. Крыху далей яна недарэчліва папаўзла ў густату моху. Я ўсьміхнуўся, усьміхнуўся й ён.

— Няхай жыве, — заўважае ён. — Ёй таксама люба свая дарога жыцьця.

— Але. Хай жыве, — адказваю я.

Мне зноў ніякавата. Ён, пэўна, спакмечвае маю бянтэжнасьць. Заходзіць наўперад мне.

— Ня верце ў прыроду — душэце яе...

Ягонае аблічча зусім іншае. Яно сталася ціхае, як бывае пагода ў летні час у Беларусі. Толькі вусны краталіся. Мне абыякава да дрыготак ягоных вуснаў, але астаюся ветлівым, хоць усё пачынае дакучаць.

— Адно папрашу ў вас, толькі адно. У наступную суботу ад'яжджаю адгэтуль. Зрабеце так, каб мяне з музыкамі праводзілі. Наша вёска славіцца добрым аркестрам... Мне дужа патрэбна гэта... Паабяцайце! Прашу вас!

...і я паабяцаў яму, а ні ледзь непамеркаваўшы, з чаго пачаць, каб памагчы майму аднавяскоўцу.